Дадатак 18

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «МАСТАЦТВА (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)»

## 1. Вучэбныя праграмы

У 2023/2024 навучальным годзе будуць выкарыстоўвацца вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі ў 2023 годзе.

Усе вучэбныя праграмы размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)*.

Звяртаем увагу, што ў вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» унесены наступныя змяненні:

у вучэбных праграмах V–VI класаў скарэкціраваны назвы асобных тэм, абноўлены прыкладны пералік мастацка-ілюстрацыйнага матэрыялу ў адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі навучэнцаў;

у кантэксце кампетэнтнаснага падыходу ў кожнай чвэрці прадугледжаны творчы ўрок, прысвечаны практычнай мастацка-творчай дзейнасці вучняў;

скарэкціравана агульная колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета ў IX класе ў адпаведнасці з часткай 2 пункта 2 артыкула 150 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (было 17 гадзін, стала 16 гадзін).

## 2. Вучэбныя выданні

У новым навучальным годзе ў адукацыйным працэсе будуць выкарыстоўвацца вучэбныя выданні, уключаныя ў «Пералік вучэбных выданняў, якія прыгодныя для выкарыстання ў бібліятэчных фондах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у 2023/2024 навучальным годзе» (зацверджаны Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь А. І. Іванцом 06.02.2023 г.). Гэты дакумент апублікаваны ў бюлетэні Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Зборнік нарматыўных дакументаў» (№ 7, 2023), размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Пералікі вучэбных выданняў*.

Электронныя версіі вучэбных дапаможнікаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (*http://e-padruchnik.adu.by*).

Да 2023/2024 навучальнага года перавыдадзены з улікам вынікаў вопытнай праверкі, вывучэння меркавання настаўнікаў і вучняў вучэбны дапаможнік:

Захарина, Ю. Ю. Искусство (отечественная и мировая художественная культура) : учебное пособие для 6 класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения / Ю. Ю. Захарина [и др.]. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2023.

Захарына, Ю. Ю. Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура): вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / Ю. Ю. Захарына [і інш.]. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023.

Рэкамендацыі па рабоце з вучэбнымі дапаможнікамі размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)*.

Да 2023/2024 навучальнага года падрыхтавана новае выданне для настаўнікаў:

Колбышева, С. И. Диалог с искусством : комплексная методика обучения искусству в 5–9 классах : учебно-методическое пособие для учителей учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / С. И. Колбышева. – Минск : Национальный институт образования, 2023.

Комплексная методыка навучання мастацтву будзе актуальная пры арганізацыі і правядзенні вучэбных заняткаў, у пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці. У методыцы прадстаўлены асноўныя педагагічныя інструменты (метады, прыёмы, тэхнікі), накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці працэсу навучання мастацтву.

Поўная інфармацыя аб вучэбна-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» у 2023/2024 навучальным годзе размешчана на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)*.

## 3. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбнага прадмета на павышаным узроўні

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучэбны прадмет «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» можа вывучацца на павышаным узроўні ў VIII і IX класах у аб'ёме не больш за дзве дадатковыя вучэбныя гадзіны на тыдзень.

Рэкамендацыі па арганізацыі вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)*.

**4. Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу**

**Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў сродкамі вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура»)**

У межах вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» асаблівую ўвагу неабходна надаваць фарміраванню функцыянальнай адукаванасці, а менавіта ўменняў і навыкаў каштоўнасна-сэнсавага *ўспрымання, аналізу, інтэрпрэтацыі, ацэнкі і стварэння мастацкага тэксту*.

Для фарміравання і ўдасканалення названых уменняў і навыкаў у працэсе засваення мастацкага тэксту рэкамендуецца:

*выкарыстоўваць творчыя заданні*, якія падахвочваюць да правядзення паралелей паміж вывучаемым матэрыялам і сучаснымі рэаліямі;

*акцэнтаваць увагу* на *ўнутры- і міжпрадметных сувязях:* выяўляць кантэкстуальнае ўзаемадзеянне з мастацкімі творамі іншых эпох; супастаўляць мастацкія творы розных відаў/ жанраў/ напрамкаў/ стыляў; выкарыстоўваць веды і ўменні, атрыманыя ў межах іншых вучэбных прадметаў (вызначыць гістарычны і сацыякультурны кантэкст, пабудаваць маршрут, вызначыць геаграфію мастацкай падзеі; выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы пры стварэнні мастацкага тэксту); прапаноўваць практыка-арыентаваныя заданні на творчую інтэрпрэтацыю мастацкага тэксту з выкарыстаннем тэхнік і матэрыялаў іншых відаў мастацтва (намаляваць/падабраць ілюстрацыю, стварыць інсталяцыю/ калаж/ скульптуру, напісаць сцэнарый/ сінопсіс, падабраць музычнае суправаджэнне, стварыць мастацкі тэкст у іншым жанры/ стылі);

*надаваць увагу фарміраванню аргументаванага каштоўнасна-ацэначнага меркавання* (эмацыянальнага стану, эстэтычных адносін, згоды/ нязгоды, агульнага/ рознага) аб мастацкім творы (сюжэт, форма, кампазіцыя, персанажы, мастацкія дэталі, жанрава-відавая разнастайнасць) і творчым працэсе (творчая задума і яе рэалізацыя з дапамогай сродкаў выразнасці, мастацкіх тэхнік і матэрыялаў);

*захоўваць прыярытэт* **практычнай мастацка-творчай дзейнасці**, накіраванай на прымяненне атрыманых ведаў у паўсядзённым жыцці

(прыклады практыка-арыентаваных заданняў прапануюцца ў зборніках серыі «Кампетэнтнасны падыход»).

Для фарміравання функцыянальнай адукаванасці настаўніку неабходна ствараць умовы для актыўнай мастацкай камунікацыі; *выкарыстоўваць індывідуальныя, групавыя і калектыўныя формы работы; стымулюючыя заданні, якія далучаюць вучняў да розных відаў мастацка-творчай дзейнасці; заданні на авалоданне навыкамі рэфлексіі*. Немалаважна развіваць *навыкі самастойнай работы*, а таксама *навыкі калектыўнай работы ў праектнай дзейнасці*. **Арганізацыя практычнай мастацка-творчай дзейнасці вучняў рэкамендавана на кожных вучэбных занятках**.

У вучэбнай праграме змяшчаюцца пералік мастацкіх твораў, дыферэнцаваных па відах мастацтва; відаў дзейнасці да кожнай тэмы, у якіх узмоцнены сацыяльна-прыкладны бок вучэбнага прадмета; патрабаванні да адукацыйных вынікаў вучняў. Прыведзены спіс мастацкіх твораў з'яўляецца прыкладным. Прапанаваныя віды дзейнасці маюць рэкамендацыйны характар. Не дапускаецца прад'яўленне да вучняў патрабаванняў, не прадугледжаных вучэбнымі праграмамі.

**Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета**

У 2023/2024 навучальным годзе актуальнай застаецца рэалізацыя ў адукацыйным працэсе выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)».

Выхаваўчыя магчымасці музычнага мастацтва выяўляюцца ў здольнасці раскрыць унутраны свет чалавека (творы К. Дэбюсі, П. Чайкоўскага, Д. Шастаковіча і інш.). З гэтай мэтай варта развіваць «наслуханасць» вучняў, уключаючы ў змест урокаў праслухоўванне музычных твораў, выкананне песень, выкарыстанне рысуначнай методыкі для перадачы музычнага вобраза і інш. Пры вывучэнні твораў архітэктуры варта звяртаць увагу на тое, што гэтыя творы сталі неад’емнай часткай сацыяльнага асяроддзя, аказваюць уплыў на эстэтычную свядомасць і выхоўваюць павагу да творчага досведу мінулых пакаленняў (палацава-паркавы ансамбль у Пецяргофе, палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы і інш.). Скульптурныя творы не толькі суадносяцца з персаналіямі і гістарычнымі падзеямі, але ў першую чаргу спрыяюць выхаванню ўважлівасці да натхнёнай прыгажосці чалавека, успрыманню формы і пластычнай дасканаласці чалавечага цела (творы Мікеланджала, А. Кановы і інш.). Знаёмства з творамі жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва накіравана на пашырэнне культурнага дыяпазону, развіццё творчых здольнасцей вучняў (творы Рафаэля, А. Рэнуара, М. Шагала і інш.). Варта надаваць належную ўвагу выхаванню «разумных эмоцый» з дапамогай кінамастацтва (фільм «Лёс чалавека» рэжысёра С. Бандарчука і інш.). Мэтазгодна таксама

выкарыстоўваць паказ сацыяльных па змесце і мастацкіх па характары фрагментаў твораў, якія аказваюць стваральны ўплыў на свядомасць вучняў. Бясспрэчная выхаваўчая сіла тэатра выяўляецца ў тым, што ён ставіць гледача ў пазіцыю «трэцяга стваральніка» (п'еса «Несцерка» і інш.). Выкарыстанне на ўроках метадаў і прыёмаў тэатральнай педагогікі (эцюд, выразнае чытанне, інсцэніроўка, тэатральная гульня, лялечныя пастаноўкі і інш.) садзейнічае маральнаму і эстэтычнаму ўдасканаленню вучняў, развіццю ў іх асобасных якасцей (упэўненасці ў сабе, калектывізму, пасяховасці і інш.).

У змесце вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» (V–XI класы) адлюстравана **тэма генацыду** беларускага народа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

У творах мастацтва, прапанаваных у вучэбных дапаможніках, ахвяры і страты беларускага народа адлюстраваны ў абагульненай форме. У рабоце «Палонных вядуць» А. Шыбнёва перададзены эпізод барацьбы партызан з фашысцкімі захопнікамі. Абаронцам Брэсцкай крэпасці прысвечаны скульптурная кампазіцыя «Смага», жывапіснае палатно «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» П. Крываногава і карціна з аднайменнай назвай І. Ахрэмчыка. У скульптурнай кампазіцыі «Маці-патрыётка Купрыянава» захаваны вобраз маці, якая выпраўляе сваіх сыноў на вайну. Карціна «Партызанская мадонна» М. Савіцкага стала сімвалам трагедыі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Кожная работа цыкла карцін «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага – асобная старонка гісторыі ваеннага перыяду. Асаблівае месца ў творчасці мастака займае і тэма дзіцячых лёсаў, скалечаных вайной. Гэта тэма таксама вылучаецца ў творчасці кінарэжысёраў В. Турава («Я родам з дзяцінства»), І. Дабралюбава («Іван Макаравіч»).

Таксама трэба акцэнтаваць увагу вучняў і на мужнасці народа-пераможцы. Радасць Перамогі, вызваленне гарадоў і вёсак, адноўленая справядлівасць знайшлі адлюстраванне ў мастацкіх творах розных відаў мастацтва. Трыумф беларускага народа шматпланава адлюстраваны ў кампазіцыі «Мінск 3 ліпеня 1944 года» В. Волкава.

Метадычныя рэкамендацыі па асвятленні палітыкі генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з выкарыстаннем інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў і дакументаў па расследаванні крымінальнай справы, прадстаўленых Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, а таксама прэзентацыі размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год /Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні*.

У 2023/2024 навучальным годзе рэкамендуецца выкарыстоўваць у адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі

**інтэрактыўныя дыдактычныя матэрыялы па вывучэнні памятных мясцін Вялікай Айчыннай вайны**.

Матэрыялы могуць выкарыстоўвацца пры правядзенні ўрокаў па вучэбным прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» з мэтай фарміравання ў вучняў правільнай маральнай і грамадска-палітычнай пазіцыі ў адносінах да падзей і вынікаў Другой сусветнай вайны, фундаментальных каштоўнасцей грамадства, захавання гістарычнай памяці беларускага народа (*https://adu.by/ Электронныя адукацыйныя рэсурсы / BoxApps / Прадмет / Праекты / Праект «Культура памяці»*).

На вучэбных занятках па мастацтве мэтазгодна акцэнтаваць увагу на **нацыянальным кампаненце мастацкай культуры**, прадстаўленым пераважна ў мастацка-ілюстрацыйным матэрыяле. Творы мастацтва, створаныя беларускімі аўтарамі ў розныя гістарычныя перыяды, *прысутнічаюць у большасці тэм, якія вывучаюцца* (творы А. Кіш, Я. Драздовіча, І. Хруцкага, Ю. Пэна, М. Савіцкага і інш.). Перадаючы мастацкімі сродкамі традыцыі і навацыі, уласцівыя беларускай культуры, аўтары далучаюць вучняў да гісторыі сваёй краіны, садзейнічаюць фарміраванню грамадзянскай пазіцыі, пачуцця павагі да творчай спадчыны Беларусі. Важная роля ў мастацка-ілюстрацыйным матэрыяле адведзена *рэгіянальнаму мастацтву*, якое запрашае вучняў у падарожжа ў самыя далёкія куткі нашай краіны (г. Мір, в. Жамыслаўль, г. Ваўкавыск, г. Бабруйск і інш.).

Асаблівае выхаваўчае значэнне маюць тэмы «Сям'я ў мастацтве», «Свет дзяцінства ў мастацтве», «Вобраз маці ў мастацтве» ў V класе. Выявы маці ў іх прадстаўлены ў гістарычным разрэзе: ад глыбокай старажытнасці да цяперашняга часу. Прыклады беларускага іканапісу ў гэтых тэмах разглядаюцца і як творы мастацтва, і як помнікі беларускай культуры.

Засваенне нацыянальнай культуры садзейнічае самаідэнтыфікацыі падрастаючага пакалення, разуменню месца роднай культуры ў сусветным кантэксце, а таксама паважліваму стаўленню да разнастайнасці культурнага самавыяўлення іншых народаў.

Вялікае значэнне для ўспрымання твораў мастацтва мае наведванне вучнямі музеяў, мастацкіх галерэй, выстаў, мастацкіх майстэрняў; арганізацыя экскурсій, сустрэч з прадстаўнікамі культуры – архітэктарамі, мастакамі, музыкантамі, пісьменнікамі, акцёрамі і інш.

Улічваючы вялікі адукацыйны **патэнцыял экскурсій**, значную колькасць экскурсійных аб'ектаў і турыстычных маршрутаў у Рэспубліцы Беларусь, у новым навучальным годзе рэкамендуецца працягнуць выкарыстанне гэтай формы работы.

У 2023/2024 навучальным годзе запланавана рэалізацыя пілотнага

праекта па арганізацыі экскурсій для вучняў I–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у межах арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку ў шосты школьны дзень (далей – пілотны праект). Пілотным праектам прадугледжана правядзенне экскурсій на працягу любога вучэбнага дня тыдня (з панядзелка па пятніцу), а таксама ў пазавучэбны час, у тым ліку і ў шосты школьны дзень.

Метадычныя рэкамендацыі па рэалізацыі пілотнага праекта, пералік экскурсійных аб'ектаў і турыстычных маршрутаў, якія рэкамендуюцца для наведвання навучэнцамі, размешчаны ў раздзеле нацыянальнага адукацыйнага партала: https://vospitanie.adu.by/ Арганізацыя выхавання / Метадычныя рэкамендацыі.

**Вучэбныя праграмы «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)»** для V–VI класаў распрацаваны на аснове прынцыпу вобразна-тэматычнай дыферэнцыяцыі. Асноўныя сэнсазмяшчальныя аспекты мастацтва (чалавек і навакольны свет) неабходна даступна і выразна раскрываць з апорай на эмацыянальна-пачуццёвую сферу вучняў. Варта пазбягаць інфармацыйных перагрузак, выключыць завучванне на памяць тэарэтычных звестак, дыдактычна немэтазгодныя пісьмовыя работы. У цэнтры ўрока мастацтва павінны быць працэс успрымання мастацкага твора, выяўленне вобразнай сістэмы, вызначэнне сродкаў мастацкай выразнасці. Рэкамендуецца стымуляваць вучняў да выражэння свайго стаўлення да мастацкага твора ў вусным выказванні, дыялогавых формах работы, мастацка-творчай дзейнасці.

Змест вучэбнага матэрыялу па прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» для V–VI класаў з'яўляецца прапедэўтычным, рыхтуе вучняў да засваення вучэбнага матэрыялу ў VII–IX класах.

Вучэбныя праграмы «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» для VII–IX класаў распрацаваны на аснове гісторыка-храналагічнага падыходу. Вучні атрымліваюць магчымасць суадносіць мастацкія з'явы з асноўнымі гістарычнымі падзеямі, аналізаваць шэдэўры айчыннай і сусветнай мастацкай культуры ў кантэксце адпаведнай гістарычнай эпохі, назіраць за зменамі асноўных тэм, жанраў, відаў мастацтва, сродкаў мастацкай выразнасці ў гісторыка-культурнай дынаміцы. Значную частку зместу вучэбных праграм складае мастацтва, створанае на беларускіх землях.

Звяртаем увагу, што на вывучэнне айчыннай і сусветнай мастацкай культуры ў IX класе тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца 16 гадзін з разліку 1 вучэбная гадзіна на тыдзень

(вучэбны прадмет вывучаецца ў І паўгоддзі). Паводле зместу тэмы носяць аглядны характар.

Па вучэбным прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» **дамашнія заданні** вучням **не задаюцца**. Вучэбны матэрыял павінен быць засвоены на ўроку. Калі на наступным уроку прадугледжваецца практычная работа, то ў дзённіках указваюцца мастацкія матэрыялы, неабходныя для яе выканання. Напрыклад: *«Акварэль».*

**Атэстацыя** вучняў V–IX класаў па вучэбным прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» ажыццяўляецца без выстаўлення адзнак у балах, на аснове адзнак **«залічана», «не залічана»**.

Вучні V–IX класаў праходзяць бягучую (на вучэбных занятках), прамежкавую (выстаўленне адзнакі за чвэрць) атэстацыі і выніковую атэстацыю па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе (выстаўленне адзнакі за год).

Бягучая атэстацыя праводзіцца ў форме **паўрочнага і тэматычнага кантролю**. Паўрочны кантроль праводзіцца з мэтай праверкі і ацэнкі засваення вучнямі асобных элементаў вучэбнага матэрыялу і мае стымулюючы, карэкціруючы і выхаваўчы характар. Перыядычнасць ацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці кожнага вучня пры паўрочным кантролі вызначаецца настаўнікам у залежнасці ад спецыфікі вучэбнага матэрыялу, метадаў і форм навучання і выхавання, узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў. Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў, выяўленыя ў працэсе правядзення паўрочнага кантролю, фіксуюцца на левай старонцы класнага журнала запісам «залічана» ці «не залічана» насупраць адпаведных прозвішчаў вучняў. Паўрочны кантроль можа быць як асобным этапам, так і ўваходзіць у розныя этапы ўрока.

Тэматычны кантроль праводзіцца па заканчэнні вывучэння асобнай тэмы (тэм), пры гэтым ацэньваюцца дасягненні вучняў у лагічнай сістэме, адпаведнай структуры вучэбнай тэмы (тэм). Тэматычны кантроль арганізуецца настаўнікам у V і VI класах **на творчым уроку**,
у VII–IX класах – **на заліковым уроку**. Заліковы (творчы) урок праводзіцца **адзін раз на чвэрць** па выніках вывучэння зместу адной або некалькіх тэм. Тэму або тэмы для праверкі і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, форму і месца правядзення заліковага (творчага) урока вызначае настаўнік, які ажыццяўляе адукацыйны працэс па вучэбным прадмеце. **Пры арганізацыі заліковага (творчага) урока рэкамендуецца арыентавацца на практычную мастацка-творчую дзейнасць вучняў**.

Правядзенне заліковага (творчага) урока фіксуецца запісам у класным журнале: на левай старонцы насупраць прозвішча кожнага вучня

робіцца запіс «залічана» ці «не залічана», на правай старонцы ўказваюцца дата правядзення заліковага (творчага) урока і яго тэма (тэмы). Напрыклад: *20.10. Творчы ўрок «…»* для V і VI класаў; *20.10. Заліковы ўрок па тэме «…»* для VII–IX класаў.

Для правядзення **факультатыўных заняткаў** прапануецца выкарыстоўваць вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Яны размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)*.

**5. Дадатковыя рэсурсы**

Карысную інфармацыю для падрыхтоўкі да вучэбных заняткаў можна знайсці на наступных інтэрнэт-рэсурсах:

*https://eior.by* – адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс;

*https://adu.by* – нацыянальны адукацыйны партал;

*http://museum.by* – інфармацыйны партал «Музеі Беларусі»;

*https://muzei-mira.com* – інфармацыйны партал «Музеі свету».

**6. Арганізацыя метадычнай работы**

У 2023/2024 навучальным годзе для арганізацыі дзейнасці метадычных фарміраванняў настаўнікаў мастацтва прапануецца адзіная тэма ***«Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў па пытаннях выхавання і развіцця асобы вучня сродкамі вучэбнага прадмета „Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)“»***.

Развіццё прафесійных кампетэнцый педагогаў ажыццяўляецца праз работу метадычных фарміраванняў: школьнага, раённага (гарадскога) вучэбна-метадычных аб'яднанняў настаўнікаў, школ маладога настаўніка і ўдасканалення педагагічнага майстэрства, творчых і праблемных груп і інш. Дзейнасць метадычных фарміраванняў настаўнікаў мастацтва павінна планавацца на аснове аналізу вынікаў метадычнай работы за папярэдні навучальны год з улікам патрабаванняў нарматыўных прававых актаў, прадметна-метадычнага ўзроўню і кваліфікацыі настаўнікаў, іх прафесійных інтарэсаў і запытаў і павінна садзейнічаць іх прафесійнаму развіццю.

**На жнівеньскіх прадметных секцыях настаўнікаў рэкамендуецца абмеркаваць наступныя пытанні:**

1. Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі ў 2023/2024 навучальным годзе:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншыя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі: асноўныя

палажэнні, выхаванне ў сістэме адукацыі, агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу;

правілы бяспекі арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, спосабы эфектыўнага і бяспечнага выкарыстання ў працэсе навучання мастацтву лічбавых прылад;

змены ў вучэбных праграмах па вучэбным прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)»;

эфектыўнасць выкарыстання ў адукацыйным працэсе кампанентаў вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбным прадмеце;

выкарыстанне развіваючага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя кабінета мастацтва ў адукацыйным працэсе.

2. Аналіз вынікаў работы метадычных фарміраванняў настаўнікаў мастацтва ў 2022/2023 навучальным годзе. Планаванне работы метадычных фарміраванняў на 2023/2024 навучальны год.

На працягу навучальнага года рэкамендуецца правесці не менш за чатыры метадычныя мерапрыемствы і разгледзець на пасяджэннях метадычных фарміраванняў настаўнікаў мастацтва тэарэтычныя аспекты фарміравання рознабакова развітай, маральна сталай, творчай асобы вучня, актуальныя пытанні тэорыі і методыкі выкладання ў кантэксце разглядаемай тэмы з улікам наяўнага ў рэгіёне эфектыўнага педагагічнага досведу:

сучасны ўрок мастацтва: крытэрыі паспяховасці;

метадычныя асновы развіцця эмацыянальна-вобразнага, мастацкага мыслення вучняў на ўроках вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» праз узбагачэнне досведу мастацкага ўспрымання твораў розных відаў мастацтва і навакольнай рэчаіснасці;

тэхналогіі вучэбных праектаў (даследчых, інфармацыйных, творчых, прыкладных, гульнявых) па вучэбным прадмеце як сродак развіцця інтэлектуальных і творчых здольнасцей, маральна-этычных, грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы, асабістай ініцыятывы вучняў;

рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» на вучэбных занятках;

роля і месца экскурсій, сустрэч з прадстаўнікамі культуры, наведванняў музеяў, мастацкіх галерэй, выстаў, мастацкіх майстэрняў у выкладанні вучэбнага прадмета, выхаванні і развіцці вучняў;

фарміраванне асобасных кампетэнцый вучняў у працэсе засваення імі зместу вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» з дапамогай разнастайных прыёмаў і метадаў пазнавальнай, мастацка-творчай дзейнасці;

раскрыццё творчага патэнцыялу вучняў, развіццё мастацкага густу, узбагачэнне вопыту мастацка-творчай дзейнасці; фарміраванне ўстойлівай пазнавальнай цікавасці да вывучэння вучэбнага прадмета;

развіццё камунікатыўных уменняў, умення працаваць у камандзе, узаемнай адказнасці паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу ў працэсе арганізацыі навучання ў супрацоўніцтве;

фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый праз выкарыстанне магчымасцей сацыякультурнага, інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў сродкамі вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)»;

навучанне праз усё жыццё: магчымасці ўдасканалення прафесійнага майстэрства педагога.

З мэтай забеспячэння ўмоў для развіцця прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі праводзяцца мерапрыемствы ў адпаведнасці з Рэспубліканскім каардынацыйным планам мерапрыемстваў дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў (*https://akademy.by/index.php/be/aktual/37-anons-2*).

Навукова-інфармацыйную і арганізацыйна-метадычную дапамогу настаўнікам аказвае часопіс **«Мастацтва і школа»** (РУП «Выдавецтва „Адукацыя і выхаванне“»). Часопіс выдае матэрыялы па актуальных праблемах мастацкай культуры і мастацка-эстэтычнай адукацыі.